УДК 069:908(476)]:069.5

*С. В. Гаўрылава*

# Новыя падыходы да рэпрэзентацыі сацыякультурнага развіцця рэгіёнаў у экспазіцыях краязнаўчых музеяў Беларусі

*Аналізуючы практычны вопыт краязнаўчых музеяў Беларусі ў стварэнні экспазіцый, прысвечаных сацыякультурнаму развіццю рэгіёнаў другой паловы XX – пачатку XXI ст., аўтар разглядае адзін з папулярных у сучаснай айчыннай музейнай справе падыходаў да іх пабудовы. У яго аснове – прынцып антрапацэнтрызму, рэпрэзентацыя гісторыі праз асобу, якая з'яўляецца суб'ектам сацыякультурных працэсаў, што адбываюцца ў рэгіёне.*

Краязнаўчыя музеі складаюць значную частку ўсёй музейнай сеткі Беларусі (паводле паказчыкаў на 2015 г. – 50 % ад агульнай колькасці музеяў рэспублікі) [2, с. 163]. Рэгіянальныя краязнаўчыя музеі (часта ён адзін у горадзе ці раёне) аказваюць уплыў на фарміраванне гістарычнай свядомасці і грамадзянскай пазіцыі мясцовай супольнасці і ў першую чаргу падрастаючага пакалення, што ажыццяўляецца сродкамі «адукацыі спадчынай» [9, с. 42].

У выніку распаду СССР быў перагледжаны змест выставак беларускіх краязнаўчых музеяў: многія экспазіцыі па гісторыі савецкага перыяду (акрамя раздзелаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны) былі часткова ці поўнасцю дэманціраваны. Ва ўмовах адсутнасці спушчаных зверху метадычных рэкамендацый па пабудове адпаведных экспазіцыйных раздзелаў перад супрацоўнікамі краязнаўчых музеяў паўстала неабходнасць самастойна вырашаць праблемы запаўнення ўтвораных лакун. Пытанне аднаўлення (а ў некаторых музеях – стварэння) раздзела па гісторыі другой паловы XX – пачатку XXI ст. з'яўляецца сёння актуальным для кожнага краязнаўчага музея Беларусі. У гэты перыяд, адзін з самых складаных для музейнай рэпрэзентацыі, супрацоўнікі музеяў пераасэнсоўваюць падзеі другой паловы XX ст., выяўляюць найбольш значныя з'явы пачатку XXI ст. і шукаюць канцэптуальнае рашэнне адпаведнай экспазіцыі.

Пытанні стварэння сучасных выставак абмяркоўваюць як айчынныя, так і замежныя музейныя спецыялісты на рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, семінарах, круглых сталах, у спецыялізаваным перыядычным друку. Вопыт музеяў у стварэнні адпаведных экспазіцый, праблема камплектавання фондаў прадметамі сучаснасці адлюстраваны ў артыкулах як айчынных даследчыкаў музейнай справы і музейных супрацоўнікаў М. Бяспалай [3], Л. Валадзько [4], І. Водневай [5] і іншых, так і замежных Л. Аркіа-Лайне [1], Г.-М. Хінца [12],

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Штэблера [14] і г. д. Тэарэтычнай распрацоўкай пытанняў музейнай інтэрпрэтацыі і рэпрэзентацыі гісторыі XX – пачатку XXI ст. займаюцца вядомыя расійскія музеёлагі А. Масцяніца [8], Г. Альшэўская [10], Л. Скрыпкіна [11] і інш.

Апошнім часам у справе стварэння новых экспазіцый абазначылася тэндэнцыя, на якую звярнулі ўвагу многія спецыялісты. У прыватнасці, у адным са сваіх артыкулаў расійскі гісторык і музеёлаг М. Каўлен пра гэту тэндэнцыю напісала наступнае: «Одно из наметившихся направлений интерпретации – показ истории через индивидуального человека, через личность. Возникающая при этом коммуникация, субъектами которой являются две личности – человек иного исторического времени и современный посетитель – в значительной степени меняет характер восприятия экспозиции» [7, с. 219]. Важнасць такога падыходу ў паказе гісторыі таксама адзначыла даследчык музейнай справы І. Чувілава: «Это чувство узнавания, самоидентификации, фиксирование себя в определенной точке пространственно-временного континуума очень важно сегодня для установления полноценной коммуникации <…> В значительной мере это узнавание происходит благодаря показу локальной истории через личность, когда далекие и малопонятные события обретают подлинные лица и голоса» [13, с. 30–31]. Выбар асобы для музейнай рэпрэзентацыі адлюстроўвае ўяўленне мясцовай грамадскасці аб яе ролі ў сацыякультурным развіцці рэгіёна.

Праблема паказу гісторыі праз асобу стала прадметам дыскусій спецыялістаў яшчэ ў 1980-х гг., што было не ў апошнюю чаргу выклікана «антрапалагічным паваротам» у сацыяльна-гуманітарных навуках. Пытанне аб вызначэнні ролі асобы ў гісторыі і яе месцы ў экспазіцыі застаецца актуальным па сённяшні дзень. Айчынныя музейныя супрацоўнікі, абапіраючыся на папярэдні вопыт, паступова змяняюць ракурс разгляду суадносін чалавека і гісторыі: не асоба змяшчаецца ў падзейны кантэкст, а кантэкст будуецца вакол асобы. Амаль у кожным краязнаўчым музеі Беларусі ёсць экспазіцыйныя комплексы, прысвечаныя знакамітым землякам, ураджэнцам краю, і тым, хто ўнёс значны ўклад у развіццё таго ці іншага рэгіёна.

У аснову пабудовы такой экспазіцыі пакладзены *прынцып антрапацэнтрызму*, калі акцэнт робіцца не на развіцці народнай гаспадаркі рэгіёна, а ў цэнтр увагі экспазіцыянера трапляе чалавек з яго вялікімі і малымі дасягненнямі. Варта заўважыць, што рэпрэзентацыя гісторыі праз асобу не можа быць расцэнена як паўнавартасная замена музейнай мадэлі гістарычнага часу ў цэлым, але можа значна ўзбагаціць экспазіцыю эматыўна і зрабіць больш цікавай для розных катэгорый наведвальнікаў. Суаднясенне агульнага і прыватнага, а таксама ўвага да індывідуальнасці («персонификация местной истории» [6, с. 229]), якая з'яўляецца суб'ектам сацыякультурных працэсаў, што адбываюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў рэгіёне і краіне (асабліва перыяду сучаснасці), з'яўляецца асновай стварэння запатрабаванай мясцовым грамадствам экспазіцыі.

У савецкі час змест экспазіцыі вызначаўся спецыяльна распрацаванымі дакументамі, а ідэалогія вылучала «герояў», вартых прадстаўлення ў музеі (Героі Сацыялістычнай Працы, перадавікі, рацыяналізатары, дэлегаты з'ездаў і пленумаў, удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, занятыя ў розных сферах народнай гаспадаркі і інш.). Сёння музеі вольныя ў выбары тых асоб, на прыкладзе якіх будзе выхоўвацца маладое пакаленне.

Са зменай у пачатку 1990-х гг. сацыякультурнай сітуацыі ў краіне з'явіліся новыя тэмы для экспазіцыйнай інтэрпрэтацыі. Назапашаныя музейныя фонды, патэнцыял якіх не быў раскрыты ў мінулыя дзесяцігоддзі, далі багаты матэрыял для экспанавання. Аналізуючы практыку беларускіх краязнаўчых музеяў па стварэнні экспазіцый, прысвечаных пасляваеннай і сучаснай гісторыі рэгіёнаў, можна вылучыць некалькі груп асоб, матэрыялы пра якіх дэманструюцца ў экспазіцыях:

1) ганаровыя грамадзяне гарадоў і раёнаў;

2) удзельнікі трагічных падзей (ваенны канфлікт, тэхнагенная катастрофа);

3) выдатныя ўраджэнцы горада і раёна – дзеячы сфер мастацтва, літаратуры, навукі, спорту і г. д.

Кожную з адзначаных вышэй груп прэзентуюць характэрныя для іх музейныя прадметы, якія могуць быць як тыповымі для большасці краязнаўчых музеяў, так і ўнікальнымі. Дзякуючы наяўнасці апошніх, экспазіцыя музея набывае экспрэсіўнасць.

Першая група прадстаўлена ў экспазіцыях даволі аднатыпна: фотапартрэты ганаровых грамадзян горада (раёна), дакумент (а часцей за ўсё – копія), які зацвярджае факт прысваення звання – пасведчанне, ганаровая грамата, прывітальны адрас і інш. Такія комплексы можна сустрэць у асноўным у музеях, якія створаны ў савецкі час, і, не зведаўшы карэнных змен, яны сваім афармленнем нагадваюць Дошку гонару. Сярод адзначаных ганаровым званнем былі прадстаўнікі партыйных органаў, кіраўнікі буйных прадпрыемстваў і ўстаноў, радавыя працаўнікі, абавязкова ўдарнікі, перадавікі і інш.

Традыцыя прысваення звання «Ганаровы грамадзянін» папулярная і ў наш час, аднак далёка не кожны краязнаўчы музей мае магчымасць папоўніць сваю экспазіцыю новымі матэрыяламі. Гэта абумоўлена як недахопам фінансавання і часта неактыўнай пошукавай працай саміх музеяў, так і немагчымасцю дамовіцца са спадчыннікамі. Некаторыя музеі пайшлі па шляху размяшчэння ў экспазіцыі інфармацыйна-даведачных тэрміналаў, якія прадстаўляюць адпаведную інфармацыю ў электронным выглядзе. Такое рашэнне, на наш погляд, мае шэраг пераваг: пашырэнне інфармацыйнага поля музея, наведвальніку



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадастаўляюцца выбар сродкаў атрымання цікавых звестак, розных відаў інфармацыі, таксама аператыўнае размяшчэнне актуальных дадзеных. З недахопаў варта ў першую чаргу адзначыць адсутнасць мемарыяльных прадметаў, што ўплывае на ўзровень атрактыўнасці (прывабнасці) музейнай экспазіцыі.

Другую групу асоб складаюць а) воіны-інтэрнацыяналісты і б) удзельнікі ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Асаблівасцю першай падгрупы з’яўляецца тое, што матэрыялы аб удзельніках вайны ў Афганістане прадстаўлены ў краязнаўчых музеях тых рэгіёнаў, ураджэнцамі якіх яны былі. Дзякуючы сумеснай рабоце музейных супрацоўнікаў з мясцовым насельніцтвам сабраны і прадстаўлены ў экспазіцыі асабістыя рэчы воінаў-інтэрнацыяналістаў: дакументы, здымкі, ваенная форма, узнагароды і інш. У асобных музеях экспазіцыйныя комплексы пабудаваны на кантрасце: рэчы з мірнага жыцця – рэчы «вайны». Так, у адной ці дзвюх сумежных вітрынах могуць знаходзіцца «мірныя» (школьны сшытак, дзіцячы малюнак, фотаздымак з аднакласнікамі, атэстат аб заканчэнні школы), і «ваенныя» (абвестка аб смерці, ваенная форма, баявыя ўзнагароды і інш.) рэчы. На наш погляд, выкарыстанне такога ўдалага прыёму робіць успрыманне экспазіцыі наведвальнікам больш эмацыянальным.

Прадстаўленне матэрыялаў пра асоб другой падгрупы характэрна для краязнаўчых музеяў, што знаходзяцца ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У такіх комплексах дэманструецца значна менш мемарыяльных прадметаў, што тлумачыцца шэрагам фактараў: сярод ліквідатараў аварыі былі прыезджыя з іншых рэгіёнаў і нават рэспублік, устанавіць сувязь з іх сем’ямі часта даволі цяжка, а экспанаваць адзенне і прыборы, якімі карысталіся ўдзельнікі ліквідацыі аварыі, увогуле немагчыма.

У адборы асоб, аднесеных намі да трэцяй групы – выдатныя ўраджэнцы горада (раёна), музеі не абмежаваны, а крытэрыі адбору абумоўлены навуковай канцэпцыяй экспазіцыі, а таксама наяўнасцю ў фондах музея прадметаў, здольных рэпрэзентаваць асобу і мадэляваць гістарычны кантэкст. Гэтая група самая шматлікая і ўключае як заслужаных урачоў, настаўнікаў, навукоўцаў, так і вядомых у краіне і за яе межамі пісьменнікаў, мастакоў, спартсменаў і інш. Яднае гэтую групу адзіны для ўсіх прыём пабудовы экспазіцыі, які заключаецца ў прэзентацыі ўзнагарод ці твораў (у тым ліку мастацтва) у залежнасці ад віду прафесійнай ці творчай дзейнасці мемаралізуемай асобы: кубкі і медалі спартсменаў, граматы заслужаных настаўнікаў, карціны мастакоў, кнігі пісьменнікаў і паэтаў, манаграфіі вучоных і інш. Дапаўняюць гэтыя комплексы часта фотапартрэты і біяграфічныя звесткі пра знакамітых землякоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасцю гэтай групы з'яўляецца падзел на ўмоўныя ўзроўні – рэгіянальны і нацыянальны. Напрыклад, народны мастак СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Сталінскіх прэмій, акадэмік Акадэміі мастацтваў СССР Заір Азгур (экспазіцыя «Уладзімір Гоманаў. Жывапіс; Заір Азгур. Скульптура» ў Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі) ці Герой Беларусі, народны мастак СССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР, БССР і Рэспублікі Беларусь, акадэмік Акадэміі мастацтваў СССР Міхаіл Савіцкі (Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей) прадстаўляюць падгрупу асоб нацыянальнага ўзроўню.

У апошнія два дзесяцігоддзі краязнаўчыя музеі асобую ўвагу надаюць развіццю культуры свайго рэгіёна, дапаўняючы экспазіцыі матэрыяламі пра мясцовых мастакоў, паэтаў, пісьменнікаў, народных майстроў. Праз аповед пра выдатных землякоў музейныя супрацоўнікі «ўпісваюць» гісторыю малой радзімы ў кантэкст агульнадзяржаўнай.

Экспазіцыі асобных краязнаўчых музеяў пабудаваны на прэзентацыі матэрыялаў асоб адной з адзначаных вышэй груп, але часта ў музеях можна назіраць іх камбінаванне, што тлумачыцца імкненнем ахапіць як мага большую колькасць мемаралізуемых асоб. Напрыклад, у Лепельскім раённым краязнаўчым музеі ў 1983 г. была адкрыта экспазіцыя, прысвечаная развіццю рэгіёна, апошні раздзел якой называўся «Зала культурнага будаўніцтва». Сярод асоб, матэрыялы якіх прадстаўлены ў гэтым раздзеле, ёсць ганаровыя грамадзяне Лепеля – удзельнікі ўсталявання савецкай улады на Лепельшчыне і вызвалення яе ў гады Вялікай Айчыннай вайны, арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху, Героі Сацыялістычнай Працы, заслужаныя ўрачы і настаўнікі БССР, на прыкладзе дзейнасці якіх распавядалася пра развіццё адукацыі, медыцыны і сельскай гаспадаркі ў раёне. Пазней экспазіцыю дапоўнілі экспанаты, якія рэпрэзентавалі развіццё мясцовага тэатральнага мастацтва. Вынікам даследчыцкай дзейнасці супрацоўнікаў музея стала прадстаўленне наведвальнікам матэрыялаў пра ўраджэнцаў Лепельшчыны, якія дасягнулі поспехаў у прафесійнай дзейнасці і ўнеслі значны ўклад у развіццё навукі, медыцыны, літаратуры, мастацтва рэспублікі.

Асобны комплекс у экспазіцыі музея прысвечаны развіццю фізічнай культуры і спорту Лепельшчыны ў пачатку XXI ст. У ім прадстаўлены матэрыялы ўдзельнікаў і пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтваў, чыя кар'ера пачыналася з заняткаў у мясцовай спартыўнай школе.

Збор матэрыялаў пра ўраджэнцаў Лепельшчыны і папаўненне імі фондаў музея праводзіцца на пастаяннай аснове. Для прадстаўлення наведвальніку новых здабыткаў пошукавай працы ў музеі выкарыстоўваецца інфармацыйны тэрмінал, дзе захоўваюцца звесткі пра людзей, якія ў 2000-я гг. атрымалі званне «Ганаровы грамадзянін горада Лепеля». Такім чынам, у апошнім раздзеле экспазіцыі Лепельскага ра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ённага краязнаўчага музея рэпрэзентавана сацыякультурнае развіццё Лепельшчыны ў другой палове XX – пачатку XXI ст. праз жыццё, дзейнасць і дасягненні ўраджэнцаў і жыхароў рэгіёна.

Рэпрэзентацыя гісторыі праз асобу з'яўляецца для беларускіх краязнаўчых музеяў адным з дзейсных сродкаў пабудовы экспазіцыі па гісторыі другой паловы XX – пачатку XXI ст. Аналіз практыкі стварэння адпаведных экспазіцый дазваляе вылучыць некалькі груп мемаралізуемых асоб, прэзентацыя матэрыялаў якіх у музейнай экспазіцыі мае свае асаблівасці. Камунікацыя, якая адбываецца паміж наведвальнікам і героем музейнага аповеду, дазваляе зрабіць успрыманне экспазіцыі эматыўна афарбаваным, даступным наведвальнікам розных катэгорый. На наш погляд, стварэнне краязнаўчымі музеямі рэспублікі экспазіцый, пабудаваных на прынцыпе антрапацэнтрызму, мае вялікі патэнцыял у ажыццяўленні культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, што робіць іх сацыякультурнымі цэнтрамі рэгіёнаў, запатрабаванымі мясцовым грамадствам.


1. *Аркио-Лайне, Л.* Экспозиционная трилогия «Память – время – чувство» в городском музее Хельсинки / Л. Аркио-Лайне // Вестн. Ассоциации «Открытый музей», 2001. – № 3. – С. 96–100.

2. Беларуская культура, 2014: стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця : зб. інфарм.-аналіт. матэрыялаў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі ; уклад.: А. Р. Гуляева, І. Б. Лапцёнак ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (старш.) [і інш.]. – Мінск : Інбелкульт, 2015. – 419 с.

3. *Бяспалая, М. А.* Сучасныя тэндэнцыі ў камплектаванні фондаў рэгіянальных музеяў як працяг традыцый Я. і К. Тышкевічаў / М. А. Бяспалая // Чацвёртыя Тышкевіцкія чытанні (г. Валожын, 24 кастр. 2012 г.) : матэрыялы чытанняў / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 5–16.

4. *Валадзько, Л.* Агляд паступленняў па сучаснай гісторыі перыяду 1997–2002 гг. Да пытання аб камплектаванні калекцый / Л. Валадзько // Музейны весн. : зб. / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2003. – Вып. 1. – С. 37–40.

5. *Воднева, И. П.* Коллекция музейных предметов по теме «Почетные граждане города Полоцка» как средство формирования гражданской позиции личности в процессе музейной коммуникации / И. П. Воднева, Т. Р. Смирнова // Віцебскі край : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 170-годдзю з дня нараджэння М. Я. Нікіфароўскага, Віцебск, 5 лістап. 2015 г. / Гал. упраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцеб. аблвыканкама, Віцеб. абл. б-ка імя У. І. Леніна, Віцеб. абл. краязнаўчы музей, Віцеб. дзярж. ун-т імя П. М. Машэрава, кафедра гісторыі Беларусі ; рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – Т. 1. – С. 240–243.

6. *Кандаурова, Т. Н.* К вопросу о проблемах построения исторических экспозиций / Т. Н. Кандаурова // Современная историография и проблемы содержания исторических экспозиций музеев : по материалам «круглого стола», Орел, 18 мая 2001 г. / редкол.: В. Л. Егоров [и др.]. – М., 2002. – С. 227–233.

7. *Каулен, М. Е.* Проблема личности в исторической экспозиции / М. Е. Каулен // Современная историография и проблемы содержания исторических экспозиций музеев : по материалам «круглого стола», Орел, 18 мая 2001 г. / редкол.: В. Л. Егоров [и др.]. – М., 2002. – С. 219–226.

8. *Мастеница, Е. Н.* Музейная интерпретация истории как культурологическая проблема / Е. Н. Мастеница // Вопросы культурологии. – 2009. – № 9. – С. 39–43.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Нуттунен, Е. А.* Музей в системе формирования исторической культуры / Е. А. Нуттунен // Человек и образование. – 2011. – № 3. – С. 40–44.

*10. Ольшевская, Г. К.* Задачи трансформации экспозиций по новейшей истории в региональных музеях / Г. К. Ольшевская // Исторические экспозиции региональных музеев в постсоциалистический период : сб. материалов Междунар. семинара, провед. в 2003–2004 гг. в России, Белоруссии и Германии / отв. ред. В. Чувилова. – СПб., 2009. – С. 37–40.

*11. Скрипкина, Л. И.* Эволюция влияния исторической науки на научную адекватность содержания экспозиций. Роль историко-краеведческих музеев в коммуникации исторических знаний в конце XX – начале XXI в. / Л. И. Скрипкина // Современная историография и проблемы содержания исторических экспозиций музеев : по материалам «круглого стола», Орел, 18 мая 2001 г. / Гос. ист. музей ; редкол.: В. Л. Егоров (гл. ред.) [и др.]. – М., 2002. – С. 123–141.

*12. Хинц, Х.-М.* Представление истории в немецких музеях / Х.-М. Хинц // Исторические экспозиции региональных музеев в постсоциалистический период : сб. материалов / М-во культуры и массовых коммуникаций Рос. Федерации, Рос. ин-т культурологии, Твер. объед. музей ; редкол.: И. В. Чувилова (отв. ред.) [и др.]. – СПб., 2009. – С. 169–172.

*13. Чувилова, И. В.* Местный музей как ключевой элемент развития идентичности / И. В. Чувилова // Новации в музейном мире. На пути к музею локальной истории нового типа : сб. науч. ст. / отв. ред. И. В. Чувилова, О. Н. Шелегина. – Новосибирск, 2017. – С. 24–52.

*14. Штеблер, В.* «Трудные темы» современной истории в баварских музеях / В. Штеблер ; пер. с нем. О. Черкаевой // Музей. – 2011. – № 10. – С. 44–48.

*S. Haurylava*

**New approaches to the representation of sociocultural development of regions in exhibitions of local history museums of Belarus**

*Analyzing the practical experience of local history museums of Belarus in the creation of exhibitions devoted to the sociocultural development of the regions of the second half of the XX – beginning of the XXI century, the author considers one of the most popular approaches to their construction in the modern national museum business. It is based on the principle of anthropocentrism, the representation of history through the person who is the subject of sociocultural processes that occur in the aregion.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 10.07.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ